# Падарожжа да пелікана.

У Беларусі адзначаны новы від птушак — кучаравы пелікан. Інфармацыю пра незвычайнага зімняга госця пацвердзілі арнітолагі грамадскага аб'яднання "Ахова птушак Бацькаўшчыны", якія для гэтага самі наведалі месца знаходкі. Пра тое, як адбылася сустрэча спецыялістаў з новай для нашай краіны птушкай, расказала супрацоўнік АПБ і аўтар "Роднай прыроды" Настасся Кузьмянкова.

Раніца. На вуліцы завея і сапраўдная зіма. Час ехаць на Чыгірынскае вадасховішча (паміж Кіраўскім і Быхаўскім раёнамі Магілёўскай вобласці) па пелікана. Пасярод зімы ў Беларусі адзначаны новы від птушак — кучаравы пелікан (Pelecanus crispus).

Адкапаўшы машыну з сумёта, каманда АПБ рушыла ў дарогу. Навокал усё белае белае... Не кожны дзень ездзіш па новыя віды, і не кожную зіму можна пабачыць пелікана.

Паведаміў пра птушку рыбалоў Аляксандр Розін, які знайшоў яе недалёка ад месца, дзе праходзілі спаборніцтвы першага этапу чэмпіянату Беларусі па лоўлі рыбы з лёду на мармышку. Вось так рыбакі дапамаглі арнітолагам. Каб не рыбалка, можа б і не даведаліся пра кучаравага госця нашай краіны.

Мы выехалі. Навокал бушаваў цыклон Даніэла, аб лабавое шкло машыны разбіваліся шматкі снегу. На сярэдзіне дарогі снег перайшоў у ледзяны дождж, усё навокал пакрылася коркай лёду. Вельмі прыгожа, аднак і вельмі небяспечна. Ад цяжару лёду бярозкі гнуліся да самай зямлі, тут і там дрэвы не вытрымлівалі і ламаліся. Вось у такое надвор'е мы апынуліся на Чыгірынскім вадасховішчы. Няшмат часу спатрэбілася, каб адшукаць нашага героя. І сапраўды, дарослая асобіна пелікана кучаравага трымалася на адкрытай вадзе ракі Друць... Надвор'е не спрыяла ні здымкам, ні доўгім назіранням. Замачыўшы оптыку і часткова фотаапараты, мы накіраваліся дадому — дарога абяцала быць складанай. Аднак, нягледзячы на стыхію, даехалі без здарэнняў.

***

***Кучаравы пелікан — самы буйны від сярод пеліканаў і адна з самых буйных (цяжкіх) птушак, якія лётаюць, на планеце. Размах яе крылаў можа дасягаць 345 сантыметраў. Таму асобныя арнітолагі называюць гэтую салідную птушку крылатым танкам.***

Складана сказаць, што прымусіла птушку заляцець у нашу краіну. У маі і ліпені кучаравы пелікан адзначаўся ў Літве. У сярэдзіне снежня польскія калегі дзяліліся фотаздымкамі маладога кучаравага пелікана. У нас адзначана дарослая птушка. Магчыма, яна прыляцела ад літоўскіх суседзяў, а магчыма, гэта зусім іншы пелікан, які чамусьці выбраў такі напрамак пералётаў.

Кучаравы пелікан падобны да ружовага, аднак у адрозненне ад яго мае апераную частку лба, якая перарываецца каля ніжняй сківіцы, белыя з шэрым налётам падкрыллі, закручаныя пёры на галаве і цёмна шэрыя лапы. Палавы дымарфізм адсутнічае.

Гняздуецца гэты від птушак ва Усходняй Еўропе і Азіі, у Сербіі і Чарнагорыі, Албаніі, Грэцыі, Румыніі, Балгарыі, Расіі, Азербайджане, Турцыі, Украіне, Манголіі, Іране, Туркменістане, Узбекістане і Казахстане. Птушкі, што гняздуюцца ў Еўропе, зімуюць ва ўсходніх міжземнаморскіх краінах, расійскія і цэнтральнаазіяцкія птушкі — у Іране, Іраку, а мангольскія — уздоўж усходняга ўзбярэжжа Кітая. У XIX—XX стагоддзях колькасць віду знізілася, а потым стабілізавалася паміж 10—20 тысячамі асобін (http://www.birdlife.org/). У Беларусі рэгістраваўся і ружовы пелікан. Апошні раз яго бачылі ў 2014 годзе ў рыбгасе "Волма". Такім чынам, пасля таго як Беларуская арніта фаўністычная камісія (БАФК)

пацвердзіць рэгістрацыю, наша краіна зможа пахваліцца двума відамі пелікана.

***Настасся КУЗЬМЯНКОВА***

**Источник:** Родная прырода. — 2016. — № 1. — С. 62-63.